# Закончылася нарада па бібліятэчнай рабоце

Учора на нарадзе было разгледжана пытанне аб выніках работы бібліятэк у 1940 годзе. З інфармацый асобных інспектараў абласных аддзелаў народнай асветы і спрэчак па гэтаму пытанню відаць, што ў многіх раёнах работа бібліятэк яшчэ не наладжана, яны не з'яўляюцца ачагом камуністычнага выхавання мас.

У Баранавіцкай, Віцебскай і іншых абласцях большасць работнікаў бібліятэк не цікавіцца, не вывучае запатрабаванняў чытачоў. Асабліва дрэнна абстаіць справа з укараненнем навукова-папулярнай, маса-ва-палітычнай і ваенна-абароннай кнігі.

Рэзкай крытыцы падверглася работа абласных бібліятэк. Яны не аказваюць метадычнай дапамогі раённым і сельскім бібліятэкам, пасылаюць мала бібліятэк-перасовак у сельскія мясцовасці. Ёсць выпадкі, калі бібліятэкі засылаюць у раён непатрэбныя кнігі.

Дрэнна абстаіць справа з вучобай бібліятэкараў.

Значнае месца ў спрэчках было аддадзена пытанню фінансіравання бібліятэк. Тт. Ліберман (Мінскі аблана), Драздова (Магілеўскі аблана) адзначылі, што мясцовыя фінансавыя органы, сельсоветы часта не лічацца з запатрабаваннямі бібліятэк, адмаўляюцца фінансіраваць іх. У выніку работнікі бібліятэкі не маюць магчымасці расшыраць кніжны фонд, папаўняць бібліятэку новай літаратурай.

У заключэнне нарада прыняла рэзалюцыю, у якой намеціла рад практычных мерапрыемстваў па наладжванню бібліятэчнай справы.